**Алег ТРУСАЎ**
кандыдат
гістарычных навук

# БЕЛАРУСІ ПАТРЭБНА ШМАТТОМНАЯ ГІСТОРЫЯ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ

*Жыццё і лёс Мікалая Улашчыка — гэта гераічнае і трагічнае змаганне за аб'ектыўнае адлюстраванне беларускай гісторыі ў другой палове XX ст., калі само існаванне беларусаў як этнасу ўвесь час знаходзілася пад вялікай пагрозай.*



*Мікалай Улашчык*

Пасля апошняй вайны, калі беларуская гістарычная навука была амаль знішчана сталінскімі катамі, і на Беларусі засталася толькі жменька былой, даваеннай інтэлегенцыі, якая цудам перажыла і Курапаты, і Калыму, і фашысцкую акупацыю, і "акаўскі" генацыд, у Мінску на доўгія часы запанавала пачварная пародыя на вывучэнне ўласнай гісторыі пад сумнавядомай назвай – *"абэцэдарычына"*.

У 40-ых – 50-ых гадах XX ст. у Маскве канчаткова склалася канцэпцыя існавання ў IX–XIV стст. міфічнай адзінай усходнеславянскай, старажытнарускай народнасці, якая мела сваю дзяржаву з цэнтрам ў Кіеве. З таго часу тэрыторыя Беларусі атрымала канкрэтную назву – *заходнія землі старажытнай Русі.* Да іх маскоўскія савецкія гісторыкі адносілі *Полацкую, Турава-Пінскую і Смаленскую землі,* а таксама *Гродзенскае княства,* а дакладней, усю этнаграфічную тэрыторыю Беларусі на пачатку XX ст.

Цікава, што Смаленск таксама трапіў у заходнія ўскраіны Русі, нягледзячы на тое, што яго назвалі "исконно русским городом" і яго беларускае мінулае было пад вялікай забаронай.

Сталіцай міфічнай дзяржавы, якую яшчэ *К.Маркс і Ф.Энгельс* называлі *"ласкутнай імперыяй Рурыкавічаў"*, быў Кіеў, але з геаграфіяй у таварышаў *Грэкава, Рыбакова* і тутэйшага акадэміка *Абэцэдарскага* справы былі даволі кепскія.

Як ні глядзі на карту Усходняй Еўропы, але Полацк, Пінск, Гродна, Тураў і нават Смаленск знаходзяцца на поўнач ад Кіева. Але калі на тую ж карту глядзець з Крамля, то і Смаленск ляжыць на заходніх абшарах ад яго ды яшчэ і па-за межамі былой Маскоўскай дзяржавы, канчаткова захапіўшай гэты горад у 1654 годзе. І толькі Ленін дазволіў некалькі тыдняў у пачатку 1919 года пабыць Смаленскай губерні у складзе ССРБ.

Знішчыўшы сапраўдных гісторыкаў і схаваўшы ў далёкіх кнігасховішчах пісьмовыя сведчанні тысячагадовай гісторыі Беларусі, сталінскія, хрушчоўскія, а потым і брэжнеўскія сатрапы пад лозунгамі змагання з рэлігіяй, вайны са старымі забабонамі, якія перашкаджаюць будаўніцтву камунізму, пачалі бязлітасна знішчаць на Беларусі помнікі гісторыі і культуры. Дастаткова толькі ўспомніць *разбурэнне Бельчыцкага манастыра ў Полацку, Дабравешчанскай царквы ў Віцебску, фарнага касцёла ў Гродне, Пустынскага манастыра ў Мсціславе, Святадухаўскай царквы і старажытнай Нямігі ў Мінску.* Пад нож бульдозераў трапілі *гарадзішчы ў Слуцку і Мінску,* быў скасаваны і раскіданы на часткі *беларускі музей,* створаны братамі Луцкевічамі

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*ў Вільні,* разбураны сотні археалагічных стаянак і курганоў, унікальных драўляных цэркваў і былых шляхецкіх сядзіб.

Не выпадкова, што шмат якія археолагі ў 50–70-ых гадах, каб дабрацца да сапраўдных слаёў "старажытнарускага часу", бульдозерамі зграбалі ў адвалы шматмятровыя слаі эпохі ВКЛ і больш позніх часоў. Ды і што тут дзіўнага, калі ў сваёй праграмнай брашуры *"У святле неабвержных фактаў" Лаўрэн Абэцэдарскі* ў 1969 годзе сцвярджаў, што палітычная гісторыя заходніх зямель Русі, як і іх культура, былі неаддзельнымі ад палітычнай гісторыі ўсёй Старажытнарускай дзяржавы. У выніку гэтага, заяўляў акадэмік, *"нават спецыялісты-археолагі не могуць вызначыць мясцовыя асаблівасці шмат якіх рэчаў, зробленых рамеснікамі ў розных старажытнарускіх землях".* Дык навошта марнаваць дзяржаўныя грошы на нейкія там раскопкі, калі ўсе старыя рэчы падобныя і аднолькавыя? Лепей збудаваць яшчэ адзін танк ці атамную падводную лодку.

Але так лічылі не ўсе...

У той жа час, у 1967 годзе, у сакавіцкім нумары часопіса "Полымя" з'явілася рэцэнзія *Мікалая Улашчыка на кнігу Л.Аляксеева "Полацкая зямля".* У гэтым невялічкім артыкуле даследчык даў бліскучую ацэнку ролі Полацкай зямлі ў нашай гісторыі. *"... Полацкая зямля – буйнейшае княства ва ўсходняй славяншчыне. Па заходнееўрапейскіх маштабах – гэта такая сярэдневечная дзяржава, як герцагства Баварыя ці Каралеўства Партугалія. ... Як асобная адзінка Полацкае княства існавала з канца IX па сярэдзіну XIII ст. ... Ні адно з княстваў старажытнай Русі не жыло такім асобным жыццём і не было так ізалявана ад*



*Царква Барыса і Глеба Бельчыцкага Барысаглебскага манастыра. Пабудавана ў XII ст. Разбурана ў першай палове XX ст. Гравюра XIX ст.*



*Дабравешчанская царква ў Віцебску. Пабудавана ў сярэдзіне XII ст. Разбурана ў 1962 г. Малюнак канца XIX ст.*

*Кіева як Полацкае. ... Полацкае княства першае выбілася з-пад улады Кіева, а фактычна ніколі яму і не падначальвалася."*

Далей Улашчык адзначаў асаблівую ролю археалогіі ў вывучэнні беларускай гісторыі, заклікаў берагчы помнікі археалогіі і расказваў аб знішчэнні адказнымі наменклатуршчыкамі славутага *Банцараўскага гарадзішча.* Ён лічыў, што кніга Аляксеева (якая, дарэчы, і зараз не згубіла сваёй актуальнасці) павінна быць у кожнай беларускай школе і прапанаваў перакласці яе на беларускую мову.

Да гісторыі матэрыяльнай культуры свайго народу Мікалай Улашчык звяртаўся не раз. Вызначыўшы з дапамогай даных археалогіі ролю Полацка ў генезісе беларускай дзяржаўнасці, даследчык звяртаў увагу на ўзнікненне другой сталіцы Беларусі ў XIII ст. – горада *Наваградка.* У сваёй манаграфіі *"Введение в изучение Белорусско-Литовского летописания"* Улашчык спасылаўся на выніку раскопак *Фрыды Гурэвіч і Міхася Ткачова* на наваградскім дзядзінцы і ў вакольным горадзе. Менавіта археолагі засведчылі асобную ролю Наваградка ў XIII ст., калі горад, дзякуючы выгаднаму геаграфічнаму становішчу, стаў буйным гандлёвым і культурным цэнтрам тагачаснай Беларусі і атрымаў моцную сістэму абарончых умацаванняў (у тым ліку і каменную вежу – данжон).

Шмат у якіх працах па крыніцазнаўству Беларусі XIX ст. Мікалай Улашчык падказваў сучасным археолагам і этнографам выхады на пісьмовыя першакрыніцы для аргументацыі сваіх навуковых пошукаў і адкрыццяў. Адна з такіх крыніц – *справаздачы губернатараў з тэрыторыі Літвы і Беларусі ў Санкт-Пецярбург.* Так, напрыклад, у



*Гродзенскі фарны касцёл Прачыстай Боскай Маці (фара Вітаўта). Упершыню згадваецца ў 1389 г. Узарваны ў 1961 г.*

справаздачы гродзенскага губернатара за 1838 год ёсць звесткі аб скарбе рымскіх манет, знойдзеных у Пружанскім уездзе і аб другім грашовым скарбе з Навагрудскага уезда.

Вялікую ролю для вывучэння матэрыяльнай культуры беларусаў XVI–XIX стст., на думку Улашчыка, маглі адыграць і *інвентары шляхецкіх маёнткаў*, што захаваліся, пачынаючы з XVI ст. Даследчык лічыў іх самай багатай крыніцай па сацыяльна-эканамічнай гісторыі Беларусі. Дарэчы, у інвентарах захаваліся старабеларускія назвы шматлікіх рэчаў штодзённага ўжытку: зброі, рыштунку рамеснікаў, адзення, посуду, абутку і г.д.

Мікалай Улашчык звяртаў увагу і на такую, на першы погляд, не вельмі патрэбную крыніцу для доследаў гісторыкаў матэрыяльнай культуры, як газеты XIX - пачатку XX ст. На прыкладзе *"Минских губернских ведомостей"* даследчык паказваў, што ў гэтым перыядычным выданні, пачынаючы з 1838 года, змешчаны каштоўныя звесткі па этнаграфіі і археалогіі Міншчыны.

Так, у 1878 годзе тут быў надрукаваны каталог рэчаў з музея пры Мінскім губернскім статыстычным камітэце, а у 1901 г. *у "Могилёўских губернских ведомостях"* вядомы беларускі этнограф *Е.Раманаў* надрукаваў апісанне такога цікавага перажытку мінулага, як "курная хата".

Аналізуючы шматлікія выданні пісьмовых крыніц па гісторыі ВКЛ, што пабачылі свет у XIX ст., М.Улашчык падкрэсліваў, што найбольшую колькасць звестак па гісторыі матэрыяльнай культуры Беларусі ўтрымліваюць *прыходна-расходныя кнігі Магілёўскага магістрата з 1679 па 1716 год.* Пра што толькі ні пісалі магілёўскія пісары, нават пра выраб у 1695 годзе новай гарматы для гарадскіх умацаванняў.

Асобную працу, прысвечаную *развіццю металургіі* на Беларусі ў XIX ст., Улашчык напісаў у 1958 годзе. Ён даў падрабязную характарыстыку *дзейнасці беларускіх рудняў* (а іх па Беларусі ў пачатку XIX ст. было не менш за 200), *мануфактур у Вішневе і Налібоках,* а таксама *Уладзіміраўскага завода ў в.Старынка Чэрыкаўскага ўезда і Аляксандраўскага завода ў в.Чарняўка Барысаўскага ўезда.*

Даследчык адзначаў, што з сярэдзіны XIX ст. на Беларусі, акрамя шматлікіх рудняў, дзейнічалі чатыры заводы і сем домнаў, якія працавалі на мясцовай сыравіне – балотнай і дзіррановай рудзе і драўнінным вугалю. Гэтыя прадпрыемствы забяспечвалі жалезам і чыгуном усю Беларусь, а таксама немалыя патрэбы вайскоўцаў *з Бабруйскай, Брэсцкай і Кіеўскай цытадэляў.*

Такім чынам, з канца XVIII па другую палову XIX ст. Беларусь цалкам абыходзілася без уральскага жалеза і не залежала ад сыравіннай базы Расіі. Аднак гэтыя факты не траплялі ў савецкія падручнікі па гісторыі БССР.

Зусім па іншаму мы ўбачылі сялянскі побыт пачатку XIX ст., дзякуючы кніжцы Улашчыка *"Была такая вёска".* У роднай вёсцы беларускага гісторыка, што знаходзілася недалёка ад Мінска, было шмат сялян, якія аралі плугамі, насілі боты, малацілі малатарняй,чыталі кнігі і выпісвалі газеты. Менавіта ў гэты час адбыліся значныя перамены ў гісторыі матэрыяльнай культуры беларускай вёскі. Улашчык зафіксіраваў на прыкладзе родных і суседзяў пераход беларускіх сялян у канцы XIX - пачатку XX ст. ад сахі да плуга, ад бараны з драўлянымі зубамі да бараны з зубамі жалезнымі, ад самаробных сярпоў, выробленых са старой касы, да фабрычных сярпоў з зазубрынкамі, ад драўляных вілаў да чатырохраговых жалезных, ад драўлянай рыдлёўкі да жалезнай, ад драўляных вёдраў да бляшаных. Гэтыя змены, якія бальшавікі потым прыпісалі "заможнаму калгаснаму ладу жыцця", узніклі да Першай сусветнай вайны і былі яскравым паказчыкам падыходу беларускай вёскі да сярэдняга ўзроўню тагачаснай сельскай гаспадаркі Заходняй Еўропы.

Такім чынам, Мікалай Улашчык аднолькава паважна ставіўся да праблемы вывучэння тысячагадовай гісторыі матэрыяльнай культуры беларускага народа на абшарах этнаграфічнай тэрыторыі Беларусі. Прычым, яго цікавілі розныя бакі гэтай праблемы, якія датычыліся побыту сялян, мяшчан, шляхты і магнатаў. Для Улашчыка былі аднолькава цікавымі ўсе сацыяльныя праслойкі беларускага грамадства, незалежна ад маёмаснага становішча і канфесійнай прыналежнасці.

Самым добрым помнікам яго дзейнасці можа стаць шматтомная гісторыя матэрыяльнай культуры Беларусі, для выдання якой ўжо назапашаны адпаведны крыніцазнаўчы і інтэлектуальны патэнцыял.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ